БУДЗЕ ПРАПАНОВА — БУДЗЕ І РАШЭННЕ

Патэнцыял тавараабароту Беларусі з Арменіяй — 150 мільёнаў долараў

Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Прэзідэнтам Рэспублікі Арменія Арменам Саркісянам.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што яму прыемна бачыць Армена Саркісяна ў Беларусі. Ён нагадаў, што днямі адбудуцца мерапрыемствы ў рамках сустрэчы Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы. На думку беларускага лідара, гэта вельмі важнае і сур'ёзнае пытанне, а візіт Прэзідэнта Арменіі і ўдзел у гэтым мерапрыемстве сведчыць аб тым, што Арменію не проста хвалюе гэтая актуальная праблема.

«Нашу пазіцыю ў гэтым плане ведаеце, — падкрэсліў ён. — Нягледзячы на рознага роду разважанні ў дэмакратычнай Арменіі, у асобе Беларусі вы заўсёды мелі і будзеце мець добрых і надзейных сяброў. Мы з вамі працуем і ў эканамічнай адзінай прасторы, уваходзім у склад Еўразійскага саюза, мы з вамі працуем у ваенна-палітычным саюзе, АДКБ. Як бы там ні гаварылі і ні пісалі, мы свята выконваем нашы дамоўленасці і ўсё, што пакладзена ў рамкі гэтых арганізацый».

Што датычыцца асновы двухбаковых узаемаадносін — тавараабароту, — Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэты паказчык расце, прырост больш за 30 %. Кіраўнік беларускай дзяржавы дадаў, што калі прыняць да ўвагі, што некалькі гадоў таму наогул нічога не было, то гэта вынік. «Але калі казаць пра наш патэнцыял, пра тавары, якія запатрабаваны вашы ў нас, то, вядома, гэта не тавараабарот. Мы сёння папросту маглі б мець 150 мільёнаў долараў тавараабароту, і гэта значна падняло б нашы адносіны на больш высокі ўзровень», — заявіў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што бакі ведаюць магчымасці адзін аднаго, таму любыя прапановы, якія будуць вылучаны Арменіяй, Беларусь разгледзіць у кароткія тэрміны і прыме адпаведныя рашэнні.

«Ведаю, што вы перажываеце складаныя чарговыя дэмакратычныя перамены, нікуды ад гэтага не падзецца. І вядома, атрымаць інфармацыю, што называецца, з першых вуснаў ад свайго сябра і калегі — для мяне гэта вельмі важна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, беларускі лідар падзякаваў Армену Саркісяну за падтрымку групы айчынных журналістаў, якія асвятлялі падзеі ў Арменіі. Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, ён асабіста тэлефанаваў Прэзідэнту Арменіі і прасіў, каб іх прынялі для паказу аб'ектыўнай карціны падзей. Армен Саркісян даў інтэрв'ю беларускай прэсе, якое разышлося вельмі шырока.

«Мы зразумелі, што адбываецца ў Арменіі. Гэта вельмі важна для нашага народа. Таму мы ў вашай асобе бачым таго чалавека, які аб'ектыўны, рэальны і гатовы падтрымліваць з Беларуссю адносіны. Мы адкажам узаемнасцю», — запэўніў беларускі лідар.

У адказ Армен Саркісян падзякаваў кіраўніку Беларусі за падтрымку і сяброўства ў драматычныя для Арменіі дні ў красавіку і маі. Ён дадаў, што ніколі не забудзе — як Прэзідэнт і як чалавек — тую ўвагу, якую армянскі лідар атрымаў ад Аляксандра Лукашэнкі. Паводле яго слоў, званкі беларускага лідара былі не проста дыпламатычнымі, гэта былі званкі ад сябра, які хоча ведаць сітуацыю і дапамагчы.

Прэзідэнт Арменіі назваў Беларусь унікальнай і адной з рэдкіх краін, паколькі вобраз нашай дзяржавы — гэта вобраз стабільнасці і прадказальнасці. «У новым свеце, у якім мы жывём, гэтыя якасці рэдка можна ўбачыць», — канстатаваў ён.

На яго думку, за гэта Беларусь высока цэніцца сусветнай грамадскасцю.

Дарэчы, сярод перспектыўных напрамкаў двухбаковага супрацоўніцтва Прэзідэнт Арменіі назваў новыя тэхналогіі, уключаючы навуку, ІТ, электронныя тэхналогіі, а таксама харчовую прамысловасць.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Ва ўрадзе

Сітуацыю з цэнамі — пад узмоцнены кантроль

Сярэдні заробак у верасні знізіўся да 963,6 рубля. У сувязі з гэтым у мінулую суботу ва ўрадзе дэталёва разгледзелі сітуацыю па кожнай галіне і выпрацавалі шляхі дасягнення запланаванага ўзроўню. На гэтым акцэнтаваў увагу кіраўнік урада Сяргей РУМАС на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Былі падведзены вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця за дзевяць месяцаў гэтага года. У цэлым краіна рухаецца ў рамках прагнозных паказчыкаў.

Быў адзначаны рост эканомікі вышэйшы за запланаваны ўзровень — 103,7 %, пры прагнозе на гэты перыяд 103,3 %. Больш тавараў і паслуг пастаўлена на экспарт. Прычым рост назіраецца па ўсіх групах тавараў. У выніку сальда знешняга гандлю нашай краіны станоўчае — 580 мільёнаў долараў, але яно на 210 мільёнаў долараў меншае, чым у адпаведным перыядзе мінулага года.

«Інфляцыя знаходзіцца ў зададзеных параметрах — 3,7 % да снежня 2017 года пры прагнозе на дзевяць месяцаў не больш за 4,3 %, — адзначыў прэм'ер-міністр. — У верасні адбыўся рэзкі рост — плюс 0,8 %, наперадзе яшчэ два месяцы да канца года, таму я прашу міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю, усіх кіраўнікоў узяць пад узмоцнены кантроль да канца года сітуацыю з цэнамі».

Забяспечана дадатная дынаміка рэальных грашовых даходаў насельніцтва. «Як і планавалі, рэспубліканскі бюджэт выконваецца з прафіцытам. У студзені — верасні ён склаў 3,38 мільярда рублёў, ці 3,8 % да ВУП. Гэта дазволіла поўнасцю і ў тэрмін разлічыцца па даўгах. У цэлым вынікі нядрэнныя, але мы бачым, што дынаміка ВУП пачала запавольвацца. У двух рэгіёнах не выкананы ключавыя паказчыкі эфектыўнасці па валавым рэгіянальным прадукце: у Гомельскай і Магілёўскай абласцях», — звярнуў увагу Сяргей Румас. Ён папрасіў кіраўнікоў абласцей у сваіх дакладах сканцэнтравацца на выніках года і мерах, якія дазволяць выканаць паказчыкі.

Складаная сітуацыя ў сельскай гаспадарцы. З-за няпростых умоў вясны і лета істотна недабралі збожжа і зернебабовых культур. У выніку ў раслінаводстве праселі на 4,1 % да ўзроўню мінулага года. Кіраўнік дзяржавы ўстанавіў тэрмін заканчэння работ па ўборцы — 7 лістапада.

Захоўваюцца нядрэнныя тэмпы росту ў будаўніцтве — 106,7 % да дзевяці месяцаў 2017 года. Адначасова тэмпы росту аб'ёмаў будаўніцтва жылля зніжаюцца — 91,1 %. Таксама ёсць праблемы з выкананнем заданняў па экспарце паслуг.

Сяргей Румас падкрэсліў, што да завяршэння каляндарнага года засталося два месяцы, таму ад Савета Міністраў патрабуюцца аператыўныя меры, каб «расшыць вузкія месцы ў эканамічным развіцці, не парушаючы збалансаванасці эканомікі, і забяспечыць выкананне пастаўленых перад урадам задач».

Надзея АНІСОВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Суд усё ж абавязаў Асанжа плаціць за інтэрнэт і чысціць каціны латок

Эквадорскі суд вынес рашэнне супраць заснавальніка WikiLeaks Джуліяна Асанжа, які спрабаваў аспрэчыць новыя правілы ягонага пражывання на тэрыторыі пасольства гэтай краіны ў Лондане, паведаміла Бі-бі-сі.

Суд абавязаў Асанжа плаціць за карыстанне інтэрнэтам і прыбіраць латок за сваім катом, які жыве разам з ім у пасольстве. У ліку новых правілаў было таксама патрабаванне пакідаць пасля сябе ванную ў чысціні і плаціць за ежу і пральню.

Як адзначае агенцтва Reuters са спасылкай на эквадорскага генпракурора Інгіга Сальвадора, Асанж можа знаходзіцца ў пасольстве Эквадора ў Вялікабрытаніі да таго часу, пакуль выконвае ўмовы знаходжання там.

«Калі спадар Асанж хоча застацца і жыць па правілах, ён можа заставацца ў пасольстве так доўга, наколькі ён сам гэтага захоча», — сказаў генпракурор, падкрэсліўшы, што пражыванне заснавальніка WikiLeaks у будынку дыпмісіі ўжо каштавала Эквадору 6 мільёнаў долараў.

У Бельгіі зніклі мільярды Кадафі

З бельгійскіх банкаў знікла частка сродкаў былога лівійскага лідара Муамара Кадафі. Пра гэта паведамляе тэлеканал RTBF.

Доступ да фінансаў Кадафі быў замарожаны ў 2011 годзе па рашэнні Савета Бяспекі ААН. На той момант у розных банках знаходзілася больш за 14 мільярдаў еўра.

З-за таго, што рашэнне СБ ААН не распаўсюджвалася на працэнты, якія налічваліся, за восем гадоў гэтая сума павялічылася на 3-5 мільярдаў еўра, і менавіта гэтыя даходы аказаліся выведзенымі. Як мяркуецца, грошы пайшлі групоўкам, якія ваююць у Лівіі. Распачата расследаванне.

Муамар Кадафі быў забіты паўстанцамі 20 кастрычніка 2011 года. Пасля яго смерці ў краіне пачалася грамадзянская вайна.

Клінтан дапусціла свой удзел у наступных прэзідэнцкіх выбарах у ЗША

Хілары Клінтан, экс-кандыдат у прэзідэнты ЗША і саперніца Трампа на выбарах 2016 года, у інтэрв'ю Recode не выключыла магчымасць свайго ўдзелу ў наступных выбарах. Разам з тым адназначна гаварыць аб сваім вылучэнні яна не стала, адзначыўшы, што цяпер цалкам сканцэнтравана на «прамежкавых выбарах» 6 лістапада.

«Гэтыя выбары павінны вызначыць, ці сапраўды ў нас ёсць эфектыўная сістэма стрымак і процівараг, каб прыцягнуць гэтую адміністрацыю да адказнасці», — растлумачыла яна.

Глабальны кантэкст

Munich Security Conference MSC Münchner Sicherheitskonferenz

МЮНХЕНСКІ ФАРМАТ

Ці дасць «паўтарачная» дыпламатыя рэальныя вынікі?

Сёння ў Мінску пачала работу Асноўная група Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы. Беларуская сталіца ўпершыню прымае сустрэчу гэтага форуму. Мюнхенскі фармат зарэкамендаваў сябе як адзін з найбуйнейшых і найаўтарытэтнейшых форумаў у свеце па супрацоўніцтве ў ваенна-палітычнай сферы.

Таму, безумоўна, гэта сустрэча — з шэрагу самых значных палітычных падзей за год у Беларусі. У форуме прымаюць удзел прэзідэнты Беларусі, Арменіі, прэм'ер-міністры Малдовы, Сербіі, кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў, прадстаўнікі міжнародных ваенных арганізацый і, канешне, вядучыя спецыялісты ў сферы бяспекі. Фармат дыялогу, у якім супольна задзейнічаны і эксперты, і афіцыйная ўлада, атрымаў назву «паўтарачнага ўзроўню» дыпламатыі. Унікальнасць яе ў тым, што афіцыйныя перагаворы ўлады значна фармалізаваныя, а дыскусіі экспертаў часам адарваныя ад рэальнасці. Ад сумяшчэння двух гэтых трэкаў чакаюцца найбольш якасныя і прадукцыйныя вынікі.

Секцыі Асноўнай групы праводзіліся ў разнастайных пунктах свету — Пекіне, Вене, Нью-Дэлі, Тэгеране, апошні раз — у Вашынгтоне. Рашэнне здзейсніць сустрэчу ў Мінску — папершае, прызнанне напрацовак Беларусі ў дасягненні міру ў «гарачых кропках» рэгіёна (тут дарэчы ўспомніць пра Трохбаковую кантактную групу па Украіне і Мінскую групу АБСЕ па ўрэгуляванні Карабахскага канфлікту). Па-другое, мае значэнне і знаходжанне краіны — паміж Захадам і Усходам, таму ўзаемаадносіны гэтых рэгіёнаў стануць вядучай тэмай для абмеркавання.

Градус сустрэчы, на думку спецыялістаў-міжнароднікаў, дадае рашэнне Злучаных Штатаў выйсці з дагавора аб ракетах малай і сярэдняй дальнасці і планы размясціць у Польшчы ваенную базу, якая атрымае назву «Форт Трампа».

З нагоды візіту на «мінскую» Мюнхенскую канферэнцыю прэзідэнта Арменіі Армэна Саркісяна магчыма, што ў пэўных колах будзе абмяркоўвацца і Карабахскі канфлікт.

Як вядома, эканоміка з палітыкай заўсёды ходзяць разам, таму адна з тэм сустрэчы будзе закранаць эканамічную сітуацыю ва Усходняй Еўропе. У гэтым ракурсе найбольш актуальна гучыць праблематыка санкцый, узаемаадносіны ЕАЭС і Еўрапейскага саюза.

Важнае дасягненне сустрэчы ў Мінску — увогуле з'яўленне дыялогу. Як адзначаюць эксперты, мы жывём у той час, калі сам факт размовы, дыскусіі супрацьлеглых бакоў — ужо навіна. «Адзінае, што мы сёння можам зрабіць для таго, каб сітуацыя не пагоршылася, а па магчымасці і паляпшалася, — набрацца цярпення і сфакусавацца на тым мінімуме пазітыўных ідэй, якія прымальныя для ўсіх бакоў і дапамогуць адсунуць на другі план той велізарны недавер і супярэчнасці. У цэлым зразумела, калі разбураецца сістэма кантролю над зброяй і сістэма стратэгічнай стабільнасці, якая на працягу дзесяцігоддзяў была краевугольным каменем міру і бяспекі на ўсёй планеце, гэта і павінна стаць тым сінергічным эфектам», — такім бачыць практычныя вынікі работы Асноўнай групы кіраўнік экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог» Яўген Прэйгерман.

Ці знойдуць агульную мову афіцыйныя ўлады і эксперты, ці выпрацуюць прымальныя для ўсіх бакоў ідэі бяспекі і супрацоўніцтва, убачым па выніках форуму, якія падвядуць ужо заўтра. Пацвярджэнне таго, што дыскусіі будуць насамрэч насычанымі і плённымі, — шэраг аўтарытэтных гасцей. Сярод іх заяўлены генеральны сакратар АБСЕ Томас Грэмінгер, еўракамісар па еўрапейскай палітыцы суседства і перагаворах аб пашырэнні ЕС Ёханес Хан, першы намеснік прэм'ер-міністра Азербайджана Ягуб Эйюбаў.

Падрабязней пра сустрэчу Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы чытайце ў наступных нумарах «Звязды».

Марыя ДАДАЛКА.